**УДК 338.4**

# МЕСЦА АГРАРНА-ЭКАЛАГІЧНАГА ТУРЫЗМУ Ў КАНЦЭПТУАЛЬНАЙ МАДЭЛІ ЭКОЛАГА-САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПЕРЫФЕРЫЙНАЙ ТЭРЫТОРЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАГА РЭГІЁНУ)

***А.В. ЗАХАРАЎ, У.А. ГАНСКІ***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Перспектывы развіцця аграрна-экалагічнага турызму ў Полацкім рэгіёне вызначаюцца існуючымі аб'ектыўнымі тэндэнцыямі: імкненнем да павелічэння аб'ёмаў экспарту турыстычных паслуг ва ўмовах недастатковага развіцця і невялікага ўзроўню якасці айчыннай турыстычнай інфраструктуры, зыходзячы з гэтага – арыентацыя на турыстаў з базавымі патрабаваннямі да ўмоў размяшчэння, а таксама шэрагам тэрытарыяльных фактараў, рэалізацыяй Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі, задачамі Нацыянальнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь і інш. У артыкуле змешчаны абагульненыя вынікі экспертнай ацэнкі патэнцыялу Полацкага рэгіёну на прадмет развіцця пазначанага віду турыстычнага бізнесу; падаецца абгрунтаванне неабходнасці правядзення комплекснай эколага-сацыяльна-эканамічнай экспертызы як найбольш эфектыўнага інструмента высвятлення эфектыўнасці любога віду гаспадарчай дзейнасці з сацыяльна-эканамічнага і экалагічнага пунктаў гледжання.*

**Уводзіны.** Багатая падзеямі гісторыя, наяўнасць вялікай колькасці археалагічных, архітэктурных, культурных і прыродных помнікаў робяць Полацкі рэгіён адным з найбольш прывабных і перспектыўных турыстычных рэгіёнаў не толькі Беларусі, але і Еўропы. Увесь час узрастаючая прывабнасць Полаччыны для развіцця аграрна-экалагічнага турызму абумоўлена разнастайнасцю яе ландшафтаў, засяроджаных на невялікай тэрыторыі з развітой сеткай камунікацый, кантраснасцю змен гэтых ландшафтаў (хвойныя і змешаныя лясы, палі і сенажаці, балоцістыя нізіны і поймы рэк, маляўнічыя ўзвышшы і азёры і г.д.). Акрамя таго, геаграфічнае размяшчэнне рэгіёну ў паўночнай частцы Беларусі, аддаленасць ад раёнаў актыўнага земляробства спрыяла лепшаму захаванню разнастайнасці і адносна меншай антрапагеннай трансфармацыі прыродных ланшафтаў, чым, напрыклад, у паўднёвай, паўднёва-ўсходняй і цэнтральнай частках Беларусі (няўдалыя спробы меліярацыі Палесся прывялі да страты важных экалагічных комплексаў і значна знізілі турыстычны патэнцыял некаторых раёнаў Гомельскай і Брэсцкай вобл.). Гэта ўмова зараз асабліва актуальна ў сувязі з галоўным патрабаваннем сучаснага працэсу развіцця цывілізацыі – экалагізацыі тэхналогій усіх відаў вытворчасці, і вытворчасць нацыянальнага турыстычнага прадукта тут не выключэнне. Таму ў Нацыянальнай праграме развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2006 – 2010 гады ў якасці асноўнай мэты мадэрнізацыі турыстычнай галіны было заяўлена ўтварэнне спрыяльнага сацыяльна-эканамічнага асяроддзя для эфектыўнага развіцця рэкрыяцыйна-турыстычнай індустрыі і фарміравання на ўзроўні сусветнага рынку канкурэнтаздольнай галіны беларускага "зялёнага" турызму менавіта на глебе эфектыўнага выкарыстання прыродна-рэсурснага, гісторыка-культурнага і геаграфічнага становішча рэгіёнаў краіны.

**Аб'ектам** прадстаўленага даследавання з'яўляецца аграрна-экалагічны турызм як від гаспадарчай і экалагічнай дзейнасці, а **прадметам** – асаблівасці развіцця аграна-экалагічнага турызму на Полаччыне як перыферыйнай тэрыторыі.

**Мэта даследавання** – вызначыць месца аграрна-экалагічнага турызму ў канцэптуальнай мадэлі эколага-сацыяльна-эканамічнага развіцця перыферыйнай тэрыторыі.

**Асноўная частка.** У шэрагу альтэрнатыўных відаў турыстычнага бізнесу, якія маглі б цалкам адпавядаць патрабаванням стратэгічных мэтаў эколага-сацыяльна-эканамічнага развіцця Полацкага рэгіёну, мэтазгодна асобна вылучыць вясковы зялёны турызм, які прынята лічыць найбольш перспектыўным у XXI стагоддзі. Вясковы турызм, з'явіўшыся ў першай палове XIX стагоддзя, заснаваны на прыёме гараджан на адпачынак жыхарамі сельскай мясцовасці, набыў зараз вялікую папулярнасць, асабліва ў Венгрыі, Чэхіі, Вялікабрытаніі і іншых краінах, якія аб'ядналіся пад эгідай Савету Еўропы ў Цэнтральна-Усходнееўрапейскую Федэрацыю па развіццю аграрна-экалагічнага турызму. Дастаткова прыкметным гэты від турыстычнага бізнесу ў Беларусі стаў толькі ў канцы XX стагоддзя. У 2006 годзе Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў выдадзены Указ аб мерах па развіццю аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь [5]. Асноўнымі цэнтрамі яго развіцця не выпадкова сталі Панямонне і Паазер'е. Лідэрамі ў развіцці гэтага віду турыстычнага бізнесу ў Беларусі, сапраўды, з'яўляюцца Віцебская (Полацкі, Расонскі, Лепельскі, Пастаўскі раён) і Гродзенская (Зэльвенскі, Карэліцкі, Лідскі раён) вобласці.

Прыкметны інтарэс да развіцця аграрна-экалагічнага турызму звязаны са змяненнем умоў існавання чалавека, рытму яго жыцця і, адпаведна, ўзроўню яго здароў'я, у сувязі з чым узрастае неабходнасць забеспячэння аптымальных умоў адпачынку, прафілактыкі, лячэння і аднаўлення здароў'я грамадзян усіх узростаў і прафесій. Аграрны турызм можа вырашыць пытанне неабходнасці рэабілітацыі, псіхічнага аздараўлення за кошт уздзеяння на здароў'е чалавека прыродных, экалагічных фактараў. Папулярнасць аграрна-экалагічнага турызму як віду адпачынку звязана з тым, што ён у найбольшай ступені адпавядае рэкрыяцыйным патрэбам людзей, якія жывуць ва ўмовах урбанізаванага асяроддзя, у раёнах са складаным экалагічым становішчам, якія пакутваюць ад гіпадынаміі і перманентнага нервовага перанапружання, якое ўзмацняецца ў краінах з фарміруючыміся рынкавымі адносінамі. Нажаль, на сёняшні дзень толькі невялікі працэнт насельніцтва Беларусі мае магчымасць наведваць замежныя курорты. Кошт паслуг у галіне агратурыстычнага бізнесу знаходзіцца ў межах пакупной здольнасці насельніцтва і ў колькасным выяўленні ў 2 – 5 разы ніжэй, чым нават у айчынных гатэлях.

Разнастайнасць цыклаў турыстычных заняткаў: пазнавальных, забаўляльных, аздараўляльных, змена ўражанняў і амаль пастаянны кантакт з прыродай у спалучэнні з прымальнымі фінансавымі выдаткамі – усё гэта робіць прывабным аграэкатурызм, ператварае яго ў адзін з эфектыўнейшых відаў аздараўляльнай і ўвогуле рэкрыяцыйнай дзейнасці.

Існуючая за мяжой эканоміка здаровага розуму даўно навучыла вясковых і гарадскіх жыхароў будаваць свае адносіны на ўзаемавыгадных прынцыпах. У выніку развіцця аграрнага турызму гараджане маюць магчымасць атрымліваць здаровы адпачынак па даволі прымальным кошце, а вяскоўцы – магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць свой жыллёвы фонд, рэалізаваць частку выробленай сельскагаспадарчай прадукцыі непасрэдна на месцы. Да таго ж, па падліках эканамістаў, прыбытак за 3 гады ад аднаго так званага койка-месца, выкарыстоўваемага ў агратурыстычным бізнесе, адпавядае прыбытку, які атрымоўваецца за той жа прамежак часу ад двух кароў хатняй прысядзібнай гаспадарцы вясковага жыхара, што ў цяперашніх сацыяльна-эканамічных умовах, асабліва ў аграрным сектары эканомікі, актуалізуе развіццё гэтага віду прадпрымальніцтва [2].

Менавіта таму гэты від малога бізнесу ў перспектыве можа стаць надзейным імпульсам у працэсе адраджэння вёскі, выхавання патрыятычных пачуццяў у грамадзян, беражлівых адносін да самабытнай культуры беларускай вёскі, прыродна-гістарычнай спадчыны Полаччыны і ўвогуле Беларусі. У ліку асноўных перадумоў фарміравання сістэмы аграрна-экалагічнага турызму на канкрэтнай тэрыторыі вылучаюцца турыстычныя рэсурсы – сукупнасць прыродных і штучна створаных чалавекам аб'ектаў, прыдатных да ўтварэння турыстычнага прадукту. Дадзеныя рэсурсныя аспекты можна падзяліць на прыродныя, сацыяльна-эканамічныя і экалагічныя. Менавіта наяўнасць сукупнасці пералічаных рэсурсных аспектаў, неабходных для развіцця вясковага турыстычнага бізнесу, у сілах забяспечыць больш эфектыўнае яго функцыянаванне. Вызначальным з'яўляецца шэраг азначаных рэсурсаў з пункту гледжання вызначэння перспектыўных тэрыторый і аб'ектаў у мэтах развіцця аграэкатурызму.

Гэта магчыма на аснове правядзення комплекснай эколага-сацыяльна-эканамічнай экспертызы (ЭСЭЭ), якая прызнана за мяжой у якасці найбольш эфектыўнага інструмента ідэнтыфікацыі эколага-сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці любога віду гаспадарчай дзейнасці. У сувязі з разглядаемым пытаннем перспектыў развіцця аграэкатурызму ў Полацкім рэгіёне, ЭСЭЭ тэрыторыі неабходна разумець у якасці працэса эканоміка-геаграфічнага мадэлявання і прагназавання эколага-сацыяльна-эканамічнага становішча ў яе межах у сувязі з развіццём турыстычнага бізнесу, на аснове выкарыстання інтэгральнага патэнцыялу тэрыторыі з мэтай прагноза яго сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці [1].

У сістэме методыкі правядзення гэтай экспертызы мэтазгодна выкарыстанне прыёмаў матэматычнай логікі, у прыватнасці тэорыі распазнавання вобразаў на аснове пабудовы булевых матрычных мадэляў. Адносна сацыяльна-эканамічнага блока сродкаў для развіцця аграрна-экалагічнага турызму неабходна адзначыць наступнае:

- у Рэспубліцы Беларусь зараз пражывае крыху менш за 10 млн. чалавек, з якіх каля 6,5 млн. – жыхары гарадоў, гэта значыць патэнцыйныя спажыўцы турыстычнага прадукту ў сельскай мясцовасці. Акрамя таго, паказчык колькасці беспрацоўных у сельскай мясцовасці, пенсіянераў, сведчыць аб магчымай іх занятасці ў аграэкатурыстычнай вытворчасці;
- сельскагаспадарчыя прадпрыемствы рэгіёну маюць пераважна плодаагароднiцкую спецыялізацыю, што дае магчымасць занятасці насельніцтва ў час збору ўраджаю;
- у межах рэгіёну зарэгістравана дастатковая колькасць гаспадароў-фермераў са спецыялізацыяй на вырошчванне пладовых, збожжавых, кармавых, гароднінавых культур, у жывёлагадоўлі, якія маглі б стаць патэнцыйнымі вытворцамі агратурыстычнага прадукту ў сельскай мясцовасці;
- наяўнасць у перыферыйным рэгіёне добра развітой транспартнай сеткі, а таксама тое, што практычна ўсе дарогі з цвёрдым пакрыццём і дарогі мясцовага значэння маюць выхад да асноўных транспарт-

ных артэрый краіны і міжнародных транспартных шляхоў, стварае надзейную сетку камунікацыі населеных пунктаў з цэнтрам сістэмы рассялення і аказвае ўплыў на працэс збліжэння спажыўцоў і вытворцаў турыстычнага прадукту ў сельскай мясцовасці;

- у экалагічным плане менавіта тэрыторыя сельскагаспадарчай зоны Беларускага Паазер'я больш экалагічна спрыяльна ў параўнанні з тэрыторыямі цэнтра і паўднёвага ўсходу краіны, экалагічнае становішча якіх ускладняецца наяўнасцю і функцыянаваннем вялікіх аграпрамысловых комплексаў [4].

Праведзены аналіз тэрыторыі Полацкага рэгіёну паказаў, што найбольш цікавымі, каштоўнымі для выкарыстання ў аграэкатурыстычным бізнесе з'яўляюцца Браслаўскі, Лепельскі, Ушацкі, Расонскі, Пастаўскі, Докшыцкі і Верхнядзвінскі раёны. Акрамя таго, сярод азначаных раёнаў рэгіёну найбольш высокія адзнакі атрымалі тэрыторыі, якія знаходзяцца на значнай адлегласці ад граніцы горада Наваполацка (Браслаўскі, Пастаўскі, Верхнядзвінскі і Докшыцкі раён), што абумоўлена, відавочна, больш высокай экалагічнасцю гэтых тэрыторый.

На аснове вынікаў ЭСЭЭ наступным этапам павінна стаць работа з сельскімі жыхарамі, сельскагаспадарчымі вытворцамі, якія маюць магчымасць забяспечыць найбольшую эфектыўнасць гэтага віду турыстычнай дзейнасці. У метадычным плане найбольш цікавым з'яўляецца анкетаванне. Пры запаўненні анкеты вяскоўцы, якія жадаюць займацца гэтым відам малога бізнесу, павінны абавязкова ўказаць наяўнасць свабодных жыллёвых плошчаў, іх стан, адпаведнасць санітарна-гігіенічным нормам, свой узровень адукацыі, магчымасць аказання канкрэтных паслуг і адметнасць гаспадаркі, якая можа зацікавіць патэнцыйных спажыўцоў і г.д. Атрыманыя па выніках анкетавання дадзеныя аб выяўленні патэнцыйных вытворцаў агратурыстычнага прадукту павінны ўтварыць банк дадзеных рэгіёнаў.

Робячы аналіз асноўных тэндэнцый развіцця аграрна-экалагічнага турызму ў Беларусі, можна зрабіць выснову аб тым, што пэўныя пазітыўныя працэсы адбываюцца і ў Полацкім рэгіёне. Назіраецца добрая дынаміка аграэкатурызму ў рэгіёне, турысцкія патокі сталі больш разнастайнымі. Але развіццё экатурызму з'яўляецца дастаткова спецыфічным відам турыстычнай дзейнасці, якая патрабуе якаснага кадравага, метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Гэтыя праблемы пачалі вырашацца на Полаччыне аднымі з першых сярод рэгіёнаў Беларусі. Развіццё аграрна-экалагічнага турызму на Полаччыне патрабуе адпаведнай каардынацыі намаганняў органаў мясцовага кіравання і смелай прыватнай ініцыятывы па рэалізацыі рэгіянальнага турыстычнага прадукту на ўнутраным і знешнім рынку турыстычных паслуг.

Далейшае развіццё аграрна-экалагічнага турызму ў Полацкім рэгіёне як важнай эколага-гістарычнай тэрыторыі павінна грунтавацца на выключна навуковым аналізе гаспадарчай дзейнасці з улікам мэтазгодна дапушчальнай экалагічнай нагрузкі на прыродна-гістарычныя комплексы. Аналіз развіцця экалагічнага турызму ў свеце паказвае, што пад уплывам попыту на рэкрыяцыю праз прыродныя фактары ў 1980-я гады адбываецца эвалюцыя сацыяльна-эканамічных мадэляў турыстычнай дзейнасці. Мадэль масавага турызму паступова замяшчаецца мадэллю ўстойлівага развіцця турызму. У межах гэтай мадэлі адным з найбольш эфектыўных яго відаў і выступае аграрна-экалагічны турызм.

На аснове аналізу сусветнага вопыту можна зрабіць выснову, што аграрна-экалагічны турызм з'яўляецца найбольш эфектыўным відам турысцка-рэкрыяцыйнай дзейнасці на перыферыйных тэрыторыях. Развіццё экалагічнага турызму дапаможа ўсвядоміць, якімі вялізнымі багаццямі з'яўляюцца ў сучасным свеце непарушаныя прыродныя тэрыторыі, зразумець, што іх значнасць будзе з цягам часу толькі ўзрастаць. Рацыянальнае рэкрыяцыйнае прыродакарыстанне не толькі будзе спрыяць стымуляванню ўязной плыні турыстаў у краіну, росту дабрабыту перыферыйных тэрыторый, але і адыграе важную ролю ў справе захавання прыродных багаццяў рэгіёну як часткі сусветных рэсурсаў [3].

**Высновы.** Аграрна-экалагічны турызм мае шэраг пераваг і з'яўляецца перспектыўнай формай асваення рынку і павышэння канкурэнтаздольнасці рэгіёну. Перспектывы развіцця гэтага віду турызму ў Полацкім рэгіёне вызначаюцца існуючымі аб'ектыўнымі тэндэнцыямі (развіццё ўязнога турызму ва ўмовах недастатковага развіцця турыстычнай інфраструктуры, арыентацыя на экатурыстаў-вандроўнікаў, якія цэняць кантакт з некранутай прыродай больш за ўзровень сэрвісу і камфорт месц размяшчэння і інш.), а таксама тэрытарыяльнымі фактарамі, рэалізацыяй Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005 – 2010 гады, задачамі Нацыянальнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2006 – 2010 гады.

ЛІТАРАТУРА

1. Ганский, В.А. Состояние и перспективы развития аграрно-экологического туризма в Республике Беларусь / В.А. Ганский // Динамика исследований: материалы 4-й междунар. науч.-практ. конф., 16 – 30 июля 2008 г. / под ред. М.П. Тодорова. – София: ООО «БялГРАД-БГ». – 2008. – С. 57 – 59.

2. Дмитриева, Т.С. Тенденции и перспективы развития туризма в малых городах Республики Беларусь / Т.С. Дмитриева // Проблемы прогнозирования и государственного регулирования социально-экономического развития: материалы 8-й науч. конф., Минск, 18 – 19 окт. 2007 г.; НИЭИ М-ва экономики Респ. Беларусь [и др.]. – Мінск, 2007. – Т. 4. – С. 240 – 241.
3. Мозговая, О.С. Инструменты управления развитием экологического туризма в регионах мира / О.С. Мозговая // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2004. – № 2. – С. 19 – 26.
4. Ниязбаева, А.Т. Пути развития экологического туризма / А.Т. Ниязбаева // Организационно-правовые аспекты инновационного развития АПК: сб. науч. тр.: в 3 ч. Ч. 1 / В.Г. Гусаков [и др.]. – Минск: Экоперспектива, 2007. – 352 с.
5. Шульженко-Суханова, И.Н. Государственная региональная политика в сфере туризма в Республике Беларусь / И.Н. Шульженко-Суханова, В.А. Ганский // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. D. Экономические и юридические науки. – 2008. – № 10. – С. 52 – 55.

*Паступіў 05.05.2010*

## THE PLACE OF AGRARIAN AND ECOLOGIC TOURISM IN THE CONCEPTUAL MODEL OF ECOLOGICAL AND SOCIO-ECONOMIC DEVELOPMENT OF PERIPHERAL TERRITORY (BY WAY OF EXAMPLE OF POLOTSK REGION)

***A. ZAKHARAU, U. GANSKI***

*Prospects for the development of agro-ecological tourism in the Polotsk region defined by existing objective tendencies: the desire to increase exports of tourism services in the context of underdevelopment and low quality level of the domestic tourist infrastructure, based on that – focus on tourists from the basic requirements for accommodation, as well as a number of territorial factors, the State Program of Rural Development, the National Programme of development of tourism in the Republic of Belarus, etc. Article contains summary results of the expert assessment of the capacity of the Polotsk region for the development of this type of tourism business provided the rationale for an integrated ecological and socio-economic expertise as the most effective instrument to determine the effectiveness of any kind business with socio-economic and environmental points of view.*